Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
12 СНЕЖНЯ 2017 г. АЎТОРАК №239 (28603)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Як змяніліся цэны на прадукты за год



Творчыя сакрэты Сяргея Бязрукава



«Калі жонкі... выгрызлі пячонкі!»
СТАР. 13

*ЛІЧБА ДНЯ*

**800 адзінак тэхнікі**

*было задзейнічана для прыборкі снегу на дарогах рэспубліканскага значэння ў мінулыя суткі, паведамілі ў дзяжурна-дыспетчарскай службе РУП «Мінскаўтадар-цэнтр». Спецыялісты таксама нагадалі аб наяўнасці адзінага тэлефоннага нумара дыспетчарскіх службаў арганізацый рэспубліканскай дарожнай гаспадаркі. Набраўшы 125 у любым рэгіёне краіны, удзельнікі дарожнага руху могуць паведаміць важную інфармацыю альбо выказаць прэтэнзіі з нагоды дарожных умоў на той ці іншай рэспубліканскай дарозе. Калі атрыманая інфармацыя адносіцца да кампетэнцыі службаў рэспубліканскай дарожнай гаспадаркі, яна не застанецца без увагі і адпаведнага рэагавання. Акрамя таго, пры неабходнасці да вырашэння праблемы будуць прыцягнутыя іншыя экстранныя і аварыйныя службы.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.12.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0330 | ▼ |
| Еўра | 2,3973 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0343 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0748 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ЧАС ДУМАЦЬ ПРА ПАДАРУНКІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Спецыялісты «Мінскрэкламы» усталёўваюць шчыты каля галоўнай ёлкі на Кастрычніцкай плошчы Мінска.

■ Падзея

## СЦЯГ АКАДЭМІІ НАВУК УЗНЯТЫ Ў АНТАРКТЫДЗЕ

**Сёння ў Мінску распачынае работу II З'езд вучоных. Удзел у ім возьмуць 2100 дэлегатаў з усіх рэгіёнаў краіны і каля 500 гасцей — навукоўцы з Саюзнай дзяржавы, краін СНД, замежных акадэмій навук, сусветных навукова-даследчых арганізацый і цэнтраў, прадстаўнікі дзяржаўных органаў кіравання.**

2017 год быў аб'яўлены ў Беларусі Годам навукі, і правядзенне з'езда стане яго выніковым мерапрыемствам, так бы мовіць заключным акордам. Мяркуецца, што на з'ездзе будуць вызначаны асноўныя, найбольш актуальныя, задачы і напрамкі развіцця навуковай сферы на далёкую перспектыву, выпрацаваны генеральная стратэгія развіцця айчыннай навукі ў эканоміцы, канцэпцыя доўгатэрміновай навукова-інавацыйнай бяспекі краіны.

СТАР. 3



■ Выхаванне гісторыяй

## Музей, з якога пачынаецца Радзіма

**У школьных музеях шмат душэўнасці і цеплыні, яны жывыя і непасрэдныя. І вучням не трэба тлумачыць, што гэта за рэч і да якой эпохі адносіцца. Яны самі археолагі і даследчыкі. Большая частка экспанатаў сабрана з іх удзелам пад кіраўніцтвам захопленых працай настаўнікаў. Тыя, каго яны заразілі сваёй апантанасцю ў дзяцінстве, потым самі ўліваюцца ў гэта свайго роду братэрства. І гэты ланцужок ніколі не перарываецца, ён больш трывалы і надзейны. Бо ў ім няма выпадковых людзей, кожны на сваім месцы...**

**Тэма школьных музеяў была закранутая падчас правядзення ў Магілёве рэспубліканскага семінара кіраўнікоў музеяў устаноў адукацыі, у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства, упраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама, супрацоўнікі дзяржаўных і школьных музеяў. Спецыялісты ацэньвалі музеі ўстаноў адукацыі Магілёва і Магілёўскага раёна з пункту гледжання іх пошукавай, даследчай і прафарыентацыйнай дзейнасці.**

### Патрыятычныя, этнаграфічныя, літаратурныя, праваслаўныя...

Музеі на любы густ і патрэбу можна знайсці ў Магілёўскай вобласці. На тэрыторыі рэгіёна ў сістэме адукацыі іх налічваецца 194. І кожны пасвойму ўнікальны.

Гісторыка-краязнаўчы музей Гадылёўскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад — сярэдняя школа Быхаўскага раёна спецыялізуецца на пошукавай дзейнасці. Яго актывістамі толькі за апошнія тры гады апрацавана 36 баявых данясенняў аб беззваротных стратах, устаноўлена 1734 імёны, якія не значыліся ў спісах пахаванняў раёна, а 88 прозвішчаў наогул адсутнічалі ў электроннай базе даных Магілёўскай вобласці. Было знойдзена 10 няўлічаных пахаванняў.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ГАЗАВУЮ ПЛІТУ ЦІ МІКРАХВАЛЁЎКУ!
Працягваецца падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!